# РЫМАШЭЎСКІ Віталь Анатольевіч



Нарадзіўся 3 сакавіка 1975 г., беларус, жыве ў Мінску.

Адукацыя вышэйшая, інжынер-будаўнік. У 1997 г. скончыў Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт.

Працаваў па спецыяльнасці, прайшоў шлях ад шэраговага супрацоўніка і да начальніка тэхнічнага аддзела. Затым пачаў займацца прыватным бізнесам.

У 1999 г. В.А.Рымашэўскі навучаўся ў Германіі на курсах Вышэйшай школы дзяржаўнага кіравання ў інстытуце «Саюз грамадскага кіравання», вывучаў эканамічны і палітычны лад ФРГ і Польшчы. У цяперашні час працуе намеснікам старшыні па міжнародных сувязях Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Хрысціянская дзелавая ініцыятыва».

Праваслаўны хрысціянін, мае багаслоўскую адукацыю. В.А.Рымашэўскі — сустаршыня аргкамітэта Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі, адзін з кіраўнікоў кампаніі «У абарону свабоды сумлення і веравызнання ў Беларусі», у межах якой было сабрана больш за 50000 подпісаў у абарону хрысціянаў.

Жанаты, мае дачку.